Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Вусені, якія ядуць вашу капусту

Бадай самая ўпадабаная гародніна ў шкоднікаў — капуста. Хто толькі яе не есць! Гэта могуць быць і крыжакветныя блошкі, і лічынкі капуснай мухі, і капусная тля, і капусная моль, і капусная соўка, і мядзведка... Але больш за ўсё шкоды ў сярэдзіне лета наносяць вусені совак, бялянак і капуснай молі.

Недаацэнка ўплыву на ўраджайнасць гэтых шкоднікаў можа пацягнуць нават поўную страту ўраджаю. Вусені соўкі пачынаюць есці лісце качана, спачатку верхнія пласцінкі, а падросшы, выядаюць у ім шматлікія хады, выклікаючы загніванне качаноў.

Самка адкладае ад 8 да 200 яек, а за сезон можа адкласці да 2,5 тысячы яек. Дарослы вусень дасягае 5 см і практычна недасягальны для хімікатаў. Таму змагацца з імі лепш адразу некалькімі сродкамі.

У першую чаргу трэба знішчаць пустазелле, бо на іх вусені могуць ад'ядацца і набірацца сіл. Кожны тыдзень трэба аглядаць лісце, каб знішчыць лічынак, пакуль яны яшчэ ўразлівыя для інсектыцыдаў. Можна проста збіраць іх уручную, лепш рабіць гэта ўвечары, калі вусені соўкі адправіліся падсілкавацца са сваіх хованак.

Таксама трэба рыхліць міжраддзі на глыбіню 8—10 см, каб знішчыць кладкі шкодніка. Каб гарантавана знішчыць шкоднікаў, трэба як мага раней пры іх з'яўленні апрацаваць расліны інсектыцыдам. Велізарную карысць могуць аказаць фосфарарганічныя прэпараты...

Капусная моль — адзін з самых небяспечных шкоднікаў капусты. Яе з'яўленне можа выклікаць масавую гібель раслін. Днём вусені хаваюцца на ніжнім

баку лісця, а ўначы і ўвечары адпраўляюцца на абед. Самкі адкладаюць па 100—700 яек.

Знішчыць іх нашчадкаў можна апырсканнем «Актэлікам», «Жукаедам» і іншымі прэпаратамі. Пакуль вусені трымаюцца кучна, можна выкарыстоўваць ручны збор. Збіраць яйкі і вусеняў трэба раніцай. Таксама можна ўжываць біялагічныя прэпараты, напрыклад «Бітаксібацылін».

ЧАМУ НЕ ЦВІЦЕ БУЛЬБА?

Бульбу вырошчваюць амаль усе агароднікі, і, калі яна не цвіце, пачынаюць хвалявацца за ўраджай. Гэты неспакой цалкам апраўданы. Дык чаму не цвіце бульба і што з гэтым рабіць?

Калі цвіце бульба? Перыяд цвіцення ў большасці сартоў прыпадае на 35-я суткі пасля высадкі ў глебу. Калі праводзілася перадпасадачнае прарошчванне бульбы, гэты перыяд можа скараціцца (25—30-я суткі). Але варта ведаць, што некаторыя сарты наогул не цвітуць па сваёй біялагічнай прыродзе і будове іх генетычнага спадчыннага кода. Раннія гатункі бульбы наогул не цвітуць. Клубні фарміруюцца яшчэ да перыяду цвіцення, а збор ураджаю можна праводзіць ужо на 35—42-я суткі пасля пасадкі.

Існуюць яшчэ і ультраранння сарты, якія хутка фарміруюць клубні і таксама не цвітуць, сыходзячы ад шматлікіх захворванняў і шкоднікаў бульбы. Збор ураджаю ажыццяўляецца на 28—32-я суткі пасля высадкі ў глебу.

Акрамя бульбы, якая не цвіце, існуюць сарты, якія можна класіфікаваць на наступныя катэгорыі:

Цвітуць добра. Градка з такімі кустамі выглядае як суцэльны кветнік.

Слаба цвітуць. Бульбяное поле мае выгляд кветкавай градкі, на якой не ўсе кветкі ўзышлі.

Рэдка цвітуць. На ўчастку з бульбай вельмі рэдка можна ўбачыць кветкі. Гэта абсалютна нармальны стан.

Акрамя генетычных прычын нецвіцення бульбы варта адзначыць прыродныя і пажыўныя фактары. Некаторыя сарты не цвітуць у засушлівы перыяд, але і пры нармальных умовах перыяду цвіцення можна і не заўважыць з прычыны маленькіх рэдкіх кветак.

Такім чынам, у сувязі з наяўнасцю сартоў бульбы, якія не цвітуць, варта разумець, што цвіценне не ўплывае на фарміраванне клубняў. Некаторыя нават спецыяльна абрываюць кветкі і бутоны. Вядома, гэтага рабіць не трэба. Навукоўцы даказалі, што абрыванне кветак шкодзіць бульбоўніку і клубням, паколькі перасоўванне чалавека паміж радамі спрыяе абрыву мноства лісткоў і нават сцёблаў расліны, а таксама затоптванню глебы. Гэта і можа прывесці да страты значнай колькасці ўраджаю.

Галоўнымі фактарамі паспяховага ўраджаю з'яўляюцца здаровы агульны выгляд расліны і своечасовы догляд.

Зусім не варта засяроджвацца на цвіценні — гэта не галоўнае. Цвіценне з'яўляецца толькі арыенцірам для кантролю над часам гатоўнасці клубняў. У большасці сартоў перыяд з'яўлення бутонаў і цвіцення супадае з пачаткам фарміравання клубняў.

Даты Падзеі Людзі

18 ліпеня

У краіне

1583 год — нарадзіўся (вёска Сэрвач, цяпер у Карэліцкім раёне) Самуіл Іванавіч Маскевіч, грамадскі дзеяч, пісьменнік-мемуарыст. У 1617—1618 гадах дэпутат трыбунальскага суда ад Навагрудскага павета, затым — навагрудскі пісар. Аўтар мемуараў, у якіх змешчана багата звестак пра вайну Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—1618 гадоў і яе вынікі, бытавыя замалёўкі, партрэты суайчыннікаў. Успаміны вызначаюцца высокім мастацкім майстэрствам, даюць аб'ектыўнае ўяўленне аб падзеях і фактах ваеннага, палітычнага і грамадскага жыцця таго часу. Памёр у 1642 годзе.

1897 год — нарадзіўся (Літва) Іосіф Казіміравіч Апанскі, беларускі дзяржаўны дзеяч. З 1924 года займаў пасаду намесніка паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе і адначасова (з 1926 года) быў начальнікам Беларускага аддзялення Галоўнага мытнага ўпраўлення СССР. Адзін з арганізатараў ліквідацыі эсэраўскага падполля ў Беларусі. Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў у 1927 годзе.

1984 год — у Мінску з выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, навучальных устаноў Масквы, акцёраў Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача быў створаны Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр. Адкрыўся 30 красавіка 1986 года спектаклем «Гэтыя незразумелыя старыя людзі...» паводле аповесці «У вайны не жаночы твар» С. Алексіевіч. Рэпертуар фарміруецца ў асноўным з твораў беларускіх, рускіх і замежных сучасных аўтараў.

У свеце

1853 год — нарадзіўся Хендрык Антон Лорэнц, нідэрландскі фізік, стваральнік класічнай электроннай тэорыі, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы. Памёр у 1928 годзе.

1898 год — нарадзіўся (Расія) Васіль Іванавіч Казакоў, удзельнік баёў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, маршал артылерыі. Удзельнік Грамадзянскай вайны на Заходнім фронце. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года — на Заходнім, Бранскім, Сталінградскім, Данскім, Цэнтральным, Беларускім і 1-м Беларускім франтах. Пад яго кіраўніцтвам у Бабруйскай аперацыі 1944 года быў выкарыстаны метад артылерыйскай падтрымкі — двайны агнявы вал. Аўтар кніг «На перавале», «Артылерыя — агонь!». Памёр у 1968 годзе.

1918 год — нарадзіўся Нэльсан Мандэла, дзяржаўны і палітычны дзеяч ПАР, актывіст нацыянальна-вызваленчага руху, змагар супраць апартэіду, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру. Памёр у 2013 годзе.

1941 год — ЦК ВКП(б) прыняў пастанову «Аб арганізацыі барацьбы ў тыле германскіх войскаў».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.43	21.27	16.44
Віцебск —	4.43	21.27	16.44
Магілёў —	4.51	21.20	16.29
Гомель —	4.56	21.09	16.13
Гродна —	5.18	21.44	16.26
Брэст —	5.26	21.36	16.10

Месяц

Маладзік 13 ліпеня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Варвары, Ганны, Лізаветы, Апанаса, Сяргея.*
К. *Караліны, Арнольда, Емяльяна, Каміля, Шымана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Задача:

— Вася абяцаў сёння зайсці і вярнуць 1000 долараў, а Пеця абяцаў зайсці і пазычыць у мяне 1000 рублёў.

Пытанне: хто да мяне прыйшоў, а хто не?

Мне доктар настойліва рэкамендаваў марское паветра. Паглядзеўшы ў кашалёк, я павесіў мойву на вентылятар.

— Ты любіш Дзеда Мароза?

— Я люблю Бабу Спякоту!

Ніколі чалавек не бывае настолькі засяроджаным, як у тым выпадку, калі нясе талерку супу з кухні ў залу.

— Я, вядома, выпіла дзве бутэлькі піва, але... я цябе кахаю.

— А я выпіў адну, так што ты мне толькі падабаешся.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2652. Нумар падпісаны ў 19.30 17 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12